# ПРАВАПІС ПРЫСТАЎНЫХ ГАЛОСНЫХ і ЗЫЧНЫХ

***ЛЕКЦЫЯ-ПРЭЗЕНТАЦЫЯ***

***па БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ***

***для слухачоў***

***падрыхтоўчага аддзялення***

***і падрыхтоўчых курсаў***

**Складальнік – дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі С.В. Чайкова**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

***О Беларусь! Мая шыпшына,***

***зялёны ліст, чырвоны цвет!***

***У ветры дзікім не загінеш,***

***чарнобылем не зарасцеш.***

Уладзімір Дубоўка



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# План

1.Правапіс прыстаўных галосных ***а, і***:

а) правапіс прыстаўной галоснай ***а***;

б) правапіс прыстаўной галоснай ***і***.

2.Правапіс прыстаўных зычных ***г, в***:

а) правапіс прыстаўной зычнай ***г***;

б) правапіс прыстаўной зычнай ***в***.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

1

# а) Правапіс прыстаўной літары ***а***



| *Прыстаўная літара* ***а*** *пішацца:* | |
|---|---|
| *у некаторых словах перад збегам зычных, першы з якіх *л, м, р** | ***аржаны***, ***аржанішча***, ***амшара***, ***амшарына*** |

***Заўвага!*** Гэтыя ж словы могуць ужывацца з прыстаўной літарай ***і***: ***іржаны***, ***іржанішча***, ***імшара***, ***імшарына***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

1

# б) Правапіс прыстаўной літары *і*

| *Прыстаўная літара* *і пішацца* | *Прыклады* |
|---|---|
| у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх *л, м, р* | |
| *перад літарай ***м*** заўсёды | ***і****мгненне*, ***і****мчаць*, ***і****мгла*, ***і****мшысты* |
| *перад літарамі ***л*** і ***р***, калі гэтым словам пачынаецца сказ | ***І****рвецца ў прастор вадаспад белапенны.* |
| *перад літарамі ***л*** і ***р***, калі слова стаіць пасля знака прыпынку | ***і****ржавы*, ***і****льняны* |
| *перад ***л*** і ***р***, калі слова знаходзіцца пасля папярэдняга слова на зычную | *з'езд* ***і****льнаводаў*, *дрот* ***і****ржавы* |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# 1
# б) Правапіс прыстаўной літары *і* (*працяг*)

| *Прыстаўная літара **і** не пішацца* | *Прыклады* |
|---|---|
| у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх *л, м, р* | |
| *пасля прыставак, якія заканчваюцца на галосную | *памчаць, замглёны, памкнуцца, зардзецца* |
| *пасля першай часткі складаных слоў, якія заканчваюцца на галосную | *вокамгненна* |
| *перад ***л*** і ***р***, калі слова знаходзіцца пасля папярэдняга слова на галосную | *на з'ездзе льнаводаў, луста ржанога хлеба* |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

2

# а) Правапіс прыстаўной літары г




| **Прыстаўны [*г*] пішацца:** |
| --- |
| *у некаторых словах, параўн.: *история*, *Анна* (руск.) – *гісторыя*, *Ганна* (бел.); |
| *у займенніках: *гэты*, *гэтакі*; |
| *у няпэўна-колькасным лічэбніку *гэтулькі*; |
| *у прыслоўях: *гэтак*, *гэтаксама*, *дагэтуль*, *адгэтуль*; |
| *у часціцах: *гэта*; |
| *у выклічніках: *гэй*, *гэ*, *га*, *го*. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# 2
# б) Правапіс прыстаўной літары в



| Прыстаўная ***в*** пішацца: |
|---|
| *перад *о́* націскным у словах славянскага паходжання ў пачатку слоў, у сярэдзіне пасля прыстаўкі на галосны, ці першай часткі складанага слова: в + *о́*… = ***в**о́сень*, ***в**о́кны*, ***в**о́льха*, ***в**о́блачны*, *за**в**о́блачны*, *шмат**в**о́пытны*; *у словах *вочы*, *востры*, *навокал* і вытворных ад іх незалежна ад націску: ***в**ачаняты*, *на**в**астрыць*, *за**в**астрыць*, *на**в**аколіца*; *у пачатку і сярэдзіне некаторых уласных назваў: ***В**о́льга*, ***В**о́сіп*, ***В**о́гненная зямля*, *Ля**в**о́н*, *Ларыв**о́**н*, *Радзі**в**о́н* і вытворных ад іх: *Лявонава*, ***Р**адзівонаўна*, ***В**осіпаўна* |
| ***Запомніць!*** *УВОГУЛЕ*, *волава*, *воспа*, *водпуск*, *вобад* |
| *перад ***у*** каранёвым у пачатку слоў славянскага паходжання: ***в**угаль*, ***в**учань*, ***в**уліца*; *перад ***у*** каранёвым у сярэдзіне слоў або другой часткі складанага слова: *за**в**ушніцы*, *па**в**учок*, *чарна**в**ус*; *ва ўласных імёнах *Навум*, *Матэвуш*, *Тадэвуш* і вытворных ад іх: *Навуменка*, *Тадэвушаў*. |
| ***Запомніце!*** ***в**ушанка*, ***в**угор*, ***в**устрыца*, *ці**в**ун*. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# 2
# б) Правапіс прыстаўной літары в (працяг)

*Прыстаўная **в** <u>не пішацца:</u>*



*перад *а* ненаціскным: *асенні, акно, аблокі;*

*перад ***о́*** націскным у словах іншамоўнага паходжання: ***о́****да,* ***о́****птыка,* ***о́****пера,* ***о́****рдэн;*

*перад *о́* націскным у большасці ўласных назваў: ***О****рша,* ***О****мск,* ***О****зераў;*

*у словах ***о****канне,* ***о****каць;*

* у словах ***о****ханне,* ***о****хаць* (але ***во****хканне*).

***Запомніць!*** НАОГУЛ

*у словах іншамоўнага паходжання: ***у****нія,* ***у****льтрафіялетавы,* ***у****нікум;*

*перад **у** прыставачным: ***у****сход,* ***у****звар,* ***у****скочыць;*

*ва ўласных назвах: *Урал, Украіна, Ульяна;*

*перад ***у***, якое развілася з рускага ***в***: *внук, власть, внимание* (руск.) – *унук, улада, увага* (бел.)

***Запомніць!*** *урна, уюн.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Дзякуй за ўвагу



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ